# ВОПЫТ КУЛЬТУРНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ І КРАІН СНД (КАНЕЦ XX – ПАЧАТАК XXI ст.)

Д.А. Крывашэй (Мінск)

Амаль з самага пачатку Рэспубліка Беларусь надавала вялікае значэнне культурнаму супрацоўніцтву ў рамках Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Пасля невялікага перапынку, які быў абумоўлены рашэннем пытанняў структурнай перабудовы ўсёй сістэмы міжнародных сувязей, у аснову якой быў пакладзены прынцып нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў, пошукам новай мадэлі ўзаемадзеяння з былымі саюзнымі рэспублікамі ў рамках новага міжнароднага аб'яднання, пачынаючы з сярэдзіны 1990-х гадоў назіралася паступовая актывізацыя культурнага супрацоўніцтва ў рамках СНД.

Звернем увагу, што ў канцэптуальных дакументах органаў дзяржаўнай улады па пытанню развіцця міжнароднага культурнага супрацоўніцтва такая міжнародная структура, як СНД, не выдзялялася. У дакументах 1990-х гадоў, пяцігадовых праграмах па развіцці культуры, якія рэгулярна прымаліся з 2000 г., а таксама ў законах "Аб зацвярджэнні Асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь" (2005 г.), законе "Аб культуры" (1991 г., новая рэдакцыя 2004 г.) у частцы культурнага супрацоўніцтва яскрава праглядваюцца асноўныя напрамкі: краіны-суседзі і падтрымка беларускай дыяспары. Акрамя гэтага у "Асноўных напрамках унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь" звярталася ўвага на важнасць культурнага аспекту трансгранічнага супрацоўніцтва.

Прававым падмуркам міждзяржаўнага ўзаемадзеяння ў сферы культурнага супрацоўніцтва ў рамках СНД стала Пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, падпісанае 15 мая 1992 г. кіраўнікамі ўрадаў дзяржаў-удзельніц СНД. Гэтым дакументам прадугледжвалася стварэнне спрыяльных умоваў для развіцця культурных сувязей і культурнага абмену.

Актыўную ролю ў фарміраванні прававой базы дзяржаў-удзельніц СНД адыгрывала Міжпарламенцкая асамблея. У галіне культуры з мэтай уніфікацыі розных відаў культурнай дзейнасці за 1992 – 2012 гг. гадоў былі прыняты каля двух дзесяткаў мадэльных законаў. Сярод якіх: мадэльны бібліятэчны кодэкс для дзяржаў-удзельніц СНД (1996 г.), мадэльныя законы "Аб ахове археалагічнай спадчыны" (1996 г.), "Аб музейным фондзе і музеях" (1996), "Аб мецэнацтве і дабрачыннай дзейнасці" (1997 г.), "Аб народных мастацкіх промыслах" (1999 г.), "Аб тэатры і тэатральнай дзейнасці" (2001 г.), "Аб клубным адпачынку" (2003 г.), "Аб культуры" (2004 г.) і інш.

Фарміравання культурнай прасторы Садружнасці Незалежных Дзяржаў садзейнічаў Савет па культурнаму супрацоўніцтву дзяржаў-удзельніц СНД, створаны ў 1995 г. У мэтах актывізацыі работы Савета рашэннем XVIII пасяджэння ў 2003 г. быў павышаны статус прадстаўніцтва ў ім да ўзроўню міністраў культуры.

Рэпазіторый ВГУ

У мэтах развіцця культурных сувязей Беларусь удзельнічала ў працы шасці рабочых груп Савета па культурнаму супрацоўніцтву: па пытаннях народнай мастацкай творчасці, па развіццю Дэльфійскага руху, распрацоўцы комплексу мерапрыемстваў па рэалізацыі шматбаковых пагадненняў аб культурным супрацоўніцтве, вывучэнню і параўнальным аналізе заканадаўчага забеспячэння культуры дзяржаў-удзельніц, па культурнай палітыцы, навукова-метадычнаму супрацоўніцтву ў галіне мастацкай творчасці.

У сакавіку 2006 г. Беларусь падпісала Пагадненне аб гуманітарным супрацоўніцтве дзяржаў-удзельніц СНД і выступіла сузаснавальніцай Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва. Дзейнасць Фонду ажыццяўлялася на падставе Рамачнай стратэгіі да 2013 г.

Шмат мерапрыемстваў праводзілася дзяржавамі Садружнасці ў рамках праграм культурнага развіцця, у якіх, як правіла, бралі ўдзел прадстаўнікі шмат якіх дзяржаў-удзельніц СНД. У сакавіку 1998 г. рашэннем Савета міністраў замежных спраў была зацверджана Праграма асноўных мерапрыемстваў супрацоўніцтва дзяржаў-удзельніц СНД у галіне культуры да 2000 г. У далейшым падобныя праграмы прымаліся на пяцігадовыя перыяды (да 2005, 2010, 2015 г.):

Савет па культурнаму супрацоўніцтву ініцыяваў прыняцце шэрагу дакументаў: пагадненняў аб стварэнні сістэмы міжбібліятэчнага абанемента дзяржаў-удзеніц СНД (1999 г.), аб вывазе і ўвозе культурных каштоўнасцей (2001 г.), аб сумеснай фільмавытворчасці (2008 г.), канцэпцый супрацоўніцтва краін-удзельніц СНД у сферы культуры (2011 г.), развіцця адукацыі ў сферы культуры і мастацтва дзяржаў-удзельніц СНД (2011 г.) і інш.

Значны імпульс культурнаму супрацоўніцтву надало падпісанне 8 мая 2005 г. на нефармальным саміце кіраўнікоў дзяржаў у г. Маскве Дэкларацыі аб культурным супрацоўніцтве дзяржаў-удзельніц СНД. Пазней на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД у Казані 26 жніўня 2005 г. было заключана Пагадненне аб культурным супрацоўніцтве. Рашэннем Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД 2011 г. быў абвешчаны Годам гісторыка-культурнай спадчыны. У той год беларускі Гомель і расійскі Ульянаўск сталі стартавай пляцоўкай пілотнага этапу Міждзяржаўнай праграмы "Культурныя сталіцы Садружнасці", якая была прынятая у 2012 г. рашэннем Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД.

Прадстаўнікі Беларусі прымалі ўдзел у сумесных мерапрыемствах СНД: Першым Міжнародным фестывалі нацыянальных мастацтваў дзяржаў-удзельніц СНД (2002 г., г. Масква), навукова-практычнай канферэнцыі "Міжкультурны дыялог на постсавецкай прасторы ў кантэксце глабалізацыі" (2003 г., г. Кіеў), Рэгіянальнай канферэнцыі дзяржаў-удзельніц СНД "Культурная палітыка – палітыка для культуры: новы профіль палітыкі ў сферы культуры" (2009 г., г. Ерэван), Адкрытым кінафестывалі краін СНД, Латвіі, Літвы і Эстоніі "Кінашок" (г. Анапа), Форуме нацыянальных кінематаграфістаў краін СНД і Балтыі (г. Масква), Бакінскім Міжнародным кінафестывалі "Усход – Захад" і інш.

Репозиторий ВГУ

Сярод знакавых шматбаковых мерапрыемстваў, адным з арганізатараў якіх з'яўлялася Беларусь, неабходна назваць два Кангрэсы дзеячаў культуры дзяржаў-удзельніц Садружнасці ў 1996 і 2004 гг. Пленарнае пасяджэнне Другога Кангрэса прайшло на базе Мірскага замка, а практычная частка – у г. Гродна ў рамках V Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур [1, с. 27].

Адметным стала правядзенне ў Мінску ў кастрычніку 2008 г. маладзёжных Дэльфійскіх гульняў, удзел у якіх прынялі музыканты, спевакі, танцоры, артысты цырку, мастакі, фатографы, дызайнеры, ды-джэі. У 2012 г. у Мінску адбыўся Маладзёжны форум опернага мастацтва краін СНД.

Як найбольш перспектыўная форма супрацоўніцтва ў рамках СНД з'яўляліся сумесныя мерапрыемствы. Сярод іх такія праводзімыя на Беларусі, як кінафестываль "Лістапад" (Мінск), музычны фестываль "Залаты шлягер" (Магілёў).

Адной з асноўных форм папулярызацыі беларускай культуры заставаліся Дні культуры Беларусі. У 2006 – 2010 гг. з 18 мерапрыемстваў такога фармату шэсць прыпадае на краіны СНД (Азербайджан, Казахстан, Кыргызстан, Расія, Таджыкістан, Украіна).

Калі гаварыць аб двухбаковым супрацоўніцтве, то за 1991 – 2012 гг. Беларусь амаль з усімі краінамі СНД заключыла міжурадавыя ці міжведамасныя пагадненні аб культурным супрацоўніцтве. Выключэннем стаў Кыргызстан, з якім у 2008 г. быў падпісаны міжведамасны пратакол аб культурным супрацоўніцтве. Міжурадавае пагадненне з Таджыкістанам, падпісанае ў 1995 г., так і не набыло моцы. Першай краінай, з якой было заключана міжведамаснае пагадненне аб культурным супрацоўніцтве, была Украіна (1993 г.), апошняй – Казахстан (2009 г.). У перыяд 1996 – 2001 гг. назіралася значнае павелічэнне дагаворна-прававой базы з Расійскай Федэрацыяй.

Культурнае супрацоўніцтва рэалізоўвалася ў разнастайных формах. Сярод іх:

- сумесныя мерапрыемствы, прысвечаныя юбілейным датам дзяржаў-удзельніц СНД;
- міжнародныя фестывалі і конкурсы, якія праводзіліся ў краінах Садружнасці (міжнародны фестываль "Славянскі базар", кінафестываль "Лістапад");
- артыстычны абмен мастацкімі калектывамі і асобнымі дзеячамі культуры і мастацтваў (правядзенне Дзён культуры);
- абмен выставамі твораў культуры і мастацтва;
- рэалізацыя сумесных навуковых праектаў у галіне культурных даследаванняў;
- падрыхтоўка кадраў з краін СНД у Беларусі і абмен выкладчыкамі і стажорамі;
- супрацоўніцтва аднапрофільных устаноў культуры па абмену вопытам;
- абмен дэлегацыямі дзеячаў культуры і да т.п.

Рэпазіторый ВДУ

Аналіз вопыту аднаўлення і развіцця культурных сувязей на прасторы СНД дазваляе вызначыць напрамкі, праца па якіх патрабавала больш пільнай увагі.

1. У перыяд, які ахоплены аналізам, у Беларусі адсутнічаў дакумент, у якім дакладна былі б сфармуляваныя прыярытэты знешняй культурнай палітыкі краіны, у прыватнасці да дзяржаў так званага "бліжэйшага замежжа". Пажаданы было б, каб такі дакумент прадугледжваў перад усім дыферэнцыраваны падыход да кожнай дзяржавы з улікам наяўнага ўзроўню развіцця культурных сувязей.

2. Ня гледзячы на разнастайнасць форм, міжнародныя культурныя сувязі Беларусі на канец перыяду так і не набылі сістэмнага характару.

3. Значнай праблемай, якую нарадзіў развал СССР, было вяртанне культурных каштоўнасцей. Першым крокам на шляху яе вырашэння стала падпісанне 14 лютага 1992 г. краінамі-удзельніцамі СНД Пагаднення аб вяртанні культурных і гістарычных каштоўнасцей дзяржавам іх паходжання [2]. Яно было накіравана на пошук і вызначэнне канкрэтных катэгорый культурных каштоўнасцей, якія належалі адной дзяржаве і знаходзіліся ў другой дзяржаве Садружнасці, для далейшага вяртання ў краіну паходжання. На жаль, праз некалькі дзён пасля падпісання – 19 лютага – пастановай Вярхоўнага Савета Расійскай Федэрацыі яно было прыпынена на тэрыторыі гэтай краіны. А ў 1995 г. – дэнансавана як прававы акт, які не адпавядае заканадаўству Расіі [3, с. 158].

4. Дэкларатыўнымі заставаліся таксама палажэнні аб рэстытуцыі артыкулу 3 Пагаднення аб супрацоўніцтве краін-удзельніц СНД ў галіне культуры ад 15 мая 1992 г. У прыватнасці, так і не была створана Міждзяржаўная экспертная камісія СНД для разгляду пытанняў і падрыхтоўкі рэкамендацый па рэстытуцыі культурна-мастацкіх каштоўнасцей.


1. Беларуская культура сёння. Гадавы агляд, 2004. / Белар. дзярж. ін-т праблем культуры навук; рэд. Скараходаў У.П. – Мінск: БелДІПК, 2005. – 352 с.
2. Соглашение о возвращении культурных и исторических ценностей государствам их происхождения, 14.02.1992 г. // Содружество: информ. вестник Совета глав государств и Совета глав правительств СНГ. – 1992. – № 2. – С. 58 – 59.
3. Ушакова, Т. Правопреемство Республики Беларусь в отношении государственных архивов / Т. Ушакова // Правовые аспекты реституции культурных ценностей: теория и практика: материалы науч.-практ. симпозиума / редкол.: Л.И. Лозенко [и др.]. – Киев, 1997. – С. 156 – 159.


Репозиторий ВГУ